**Wiaczasław Kałacej***
Białoruś

# Экалогія традыцыйнай культуры і этнамастацкая адукацыя Беларусі

**Słowa kluczowe:** sztuka ludowa, kształcenie, metody pokazowej antropotechniki

Artykuł rozpatruje dane na temat koordynacji treści i formy w procesie kształcenia w zakresie kultury ludowej na wyższych uczelniach Bialorusi w XXI wieku.

The article examines information about the experience of form and content coordination of the training process of folklore culture in higher education in Belarus at the XXI century.

У міленіум, калі ў Беларусі акрэсліліся тэндэнцыі да страты каранёвых фальклорных жанраў, перад грамадствам востра паўстала пытанне аховы традыцыйнай культуры. Напачатку XXI стагоддзя ў свеце ўсё большую ўвагу надаюць спадчыне, «літара» і «дух» якой перадаваліся спрадвеку вусным шляхам [1, с. 55]. Гаворка ідзе пра т.зв. спадчыну вуснай традыцыі (*oral heritage of humanity*) ці, як усё часцей гавораць (разумеючы пры гэтым менавіта *непісьмовы, вусны* аспект), нематэрыяльную культурную спадчыну (*intangible heritage of humanity*). Гэта – руральныя звычаі і абрады, тэхналогіі народных промыслаў, творы і манеры выканання жанраў аўтэнтычнага фальклору, якія існуюць «жыўцом» у побыце этнасу і перадаюцца вусным шляхам. Шмат у чым яна – сінанімічная з'ява ў адносінах да таго, што даследчыкі XX стагоддзя звалі «фальклорам» (у шырокім сэнсе гэтай дэфініцыі) і «традыцыйнай культурай» этнасу.

---

* Кандыдат культуралогіі, дацэнт, загадчык кафедры этналогіі і фальклору Белорусского государственного университета культуры и искусств (Мінск, Беларусь).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сярэдзіне 2000-х гадоў кіраўніцтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ) аператыўна адрэагавала на змену прыярытэтаў, адкрыўшы факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва (2003 г.), шэраг новых спецыялізацый і заснаваўшы Цэнтр захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны (у далейшым Цэнтр). Тэорыяй і практыкай этнамастацкай адукацыі ў БДУКМ займаліся пераважна даследчыкі і педагогі, якія выкладаюць на факультэце традыцыйнай беларускай культуры, супрацоўнікі аддзела традыцыйнага мастацтва Інстытута праблем культуры, які з 2007 г. ўвайшоў у структуру універсітэта. Збольшага гэта былі адныя і тыя ж асобы, таму ядро суполкі захавальнікаў традыцыйнай культурнай спадчыны стварылася па законах самаарганізацыі. Асобы, пералічаныя ніжэй (таб. 1) фармальна ўвайшлі ў склад супрацоўнікаў Цэнтра улетку 2009 г. (калі шэраг спецыялістаў аддзела традыцыйнага мастацтва ІКБ перайшлі на працу на кафедру этналогіі) і аб'ядналіся па даручэнні рэктарата УА БДУКМ для ўключэння ва Urgent Safeguarding List UNESCO абраду Калядныя Цары в.Семежава. Распачалі ж яны сумесную дзейнасць, якую з пункту гледжання логікі і прыярытэтаў захавання НКС павінны быў ажыццяўляць Цэнтр, значна раней. Сам Цэнтр быў створаны па дамоўленасці Рэспубліканскай камісіі па справах ЮНЭСКА (У.Г. Шчасны) і Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў (Я.Д. Грыгаровіч) у 2004 г. Арганізацыя працы была ўскладзена на калектыў кафедры этналогіі і фальклору, пры якой Цэнтр быў створаны на грамадскіх пачатках у адпаведнасці з загадам рэктара.

Згодна міжнародным і рэспубліканскім нарматывам па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей НКС), Цэнтр павінны быў праводзіць дзейнасць па 3 накірунках: а) **ахоўную** (праца з носьбітамі НКС у мэтах іх падтрымкі і стымуляцыі працэсу перадачы НКС паміж пакаленнямі); б) **этнакультурна-выхаваўчую** (праца з дзецьмі і моладдзю Беларусі ў мэтах інтэгравання НКС у іх асяроддзе); в) **статыстычна-рэпрэзентатыўную** (маніторынг НКС у Беларусі, інфармаванне пра вынікі міжнародную супольнасць).

Напрацягу 2004–2009 гг. калектыў кафедры этналогіі і фальклору сумесна з супрацоўнікамі аддзела традыцыйнага мастацтва Инстытута праблем культуры выпрацоўваў мадэль дзейнасці суполкі даследчыкаў і педагогаў па перайманні НКС і праводзіў дзейнасць па ўсіх трох напрамках (таб. 1).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Табліца 1

Праца па захаванні НКС ў БДУКМ з 2004 па 2015 гг.

| Напрамкі працы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ахоўная** – *праца з носьбітамі НКС у мэтах іх надтрымкі і стымуляцыі працэсу перадачы НКС паміж пакаленнямі* | | **этнакультурна-выхаваўчая** – *праца з дзецьмі і моладдзю Беларусі ў мэтах інтэгравання НКС у іх асяроддзе* | | **статыстычна-рэпрэзентатыўная** – *маніторынг НКС у Беларусі, інфармаванне пра выннікі міжнародную супольнасць* | |
| **імпрэзы** | **дата, адказныя** | **імпрэзы** | **дата, адказныя** | **імпрэзы** | **дата, адказныя** |
| 9 экспедыцый на абрад "Страла" Веткаўскага раёна з мэтай яго рэвіталізацыі, 3 – на Полацкае Купалле, 3 – на Цярэшку | 2004–2014<br>В.В. Калацэй<br>Т.А. Пладунова<br>Э.В. Шчадрына<br>Н.В. Петухова | 11 Рэспубліканскіх сезонных фальклорных школ для дзяцей і моладзі (колькасць удзельнікаў – 1200 чалавек) | 2004–2009<br>В.В. Калацэй<br>Т.А. Пладунова<br>Н.В. Петухова<br>В.М. Кулынін<br>Т.Б. Варфаламеева<br>М.А. Козенка<br>І.В. Мазюк<br>Т.І. Кухаронак<br>Р.С. Гамзовіч | Збіранне матэрыялаў па НКС у 6 гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі | 2004–2015<br>А.І. Боганева<br>Т.Б. Варфаламеева<br>М.А. Козенка<br>І.А. Смірнова<br>І.В. Мазюк<br>В.А. Лабачэўская<br>Т.І. Кухаронак<br>Р.С. Гамзовіч<br>Т.А. Пладунова<br>В.В. Калацэй<br>Н.В. Петухова |
| 8 канцэртаў "Фальклор беларускай глыбінкі" з удзелам 200 носьбітаў НКС | 2007–2014<br>А.І. Боганева<br>Т.Б. Варфаламеева<br>М.А. Козенка<br>І.А. Смірнова<br>І.В. Мазюк | 2 тыдні фальклорна-этнаграфічных фільмаў для моладзі Беларусі (к.у.–750 чал.) | 2008–2009<br>А.І. Боганева<br>Т.Б. Варфаламеева<br>М.А. Козенка<br>І.В. Мазюк<br>Т.І. Кухаронак<br>Р.С. Гамзовіч | Праца ў Рэспубліканскай камісіі па ахове Гісторыка-культурнай спадчыны | 2006–2015<br>Т.Б. Варфаламеева |
| Арганізацыя ўдзелу этнаграфічнага калектыву в. Ананчыцы на фестывалі "Славянское древо" (СПб) | 2009<br>В.В. Калацэй<br>Т.А. Пладунова<br>Э.В. Шчадрына | Распрацоўка канцэпцыі, дакументацыі і адкрыццё ў УА БДУКМ інавацыйнай спецыялізацыі "Этнафона-знаўства" для захавання аўтэнтычнай спеўнай манеры | 2004<br>В.В. Калацэй<br>Т.А. Пладунова | Падрыхтоўка Form ICH-01 (2009), відэафільма (20 хв.) і фотаздымкаў (12) для ўключэння абраду Kalyady Tsars (Christmas Tsars) в. Семежава ў Urgent Safeguarding List які фарміруе UNESCO Intangible Heritage Section | 2009<br>В.В. Калацэй<br>Т.І. Кухаронак<br>Р.С. Гамзовіч<br>А.Б. Сташкевіч<br>У.Г. Шчасны<br>А.І. Красоўская |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 8 (па статусе ад Рэспубліканскай да Міжнароднай) канферэнцыі "Аўтэнтычны фальклор" | 2007–2014<br>М.А. Бяспалая<br>М.А. Мажэйка<br>В.В. Каладзей<br>Т.А. Бабіч<br>Т.А. Пладунова<br>В.М. Кульпін | Рэвіталізацыя абраду Купалле на матэрыялаў Беларускага Падзвіння | 2009<br>Т.А. Пладунова<br>Н.В. Петухова<br>В.В. Каладзей | | |
| **Вынік к 2015 году**<br>– фарміраванне асновы сістэмы падтрымкі носьбітаў спадчыны вуснай традыцыі Беларусі з цэнтрам ва УА БДУКМ | | **Вынік к 2015 году**<br>– фарміраванне сістэмы этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі Беларусі і этнамастацкай адукацыі з цэнтрам ва УА БДУКМ | | **Вынік к 2010 году**<br>– уключэнне абрада "Цары" в.Семежава ў Urgent Safeguarding List UNESCO | |

Дзейнасць педагогаў и студэнтаў універсітэта па супрацоўніцтве з носьбітамі НКС, фарміраванні сістэмы этнакультурнага выхавання ў краіне к 2015 году адзначана як відавочна выніковая і прадуктыўная, вартая развіцця не толькі якаснага, але і колькаснага. Пералічаныя вышэй асобы працавалі ў кірунку захавання НКС (мал. 1) часам без дадатковага фінансавага заахвочвання і з'яўляліся не заўсёды фармальна "штатнымі" "целам" і "рукамі" Цэнтра. Але за тое – неаднойчы атрымлівалі станоўчую ацэнку ад фалькларыстаў з Усходняй Еўропы, Беларусі, кіраўніцтва універсітэта, Рэспубліканскай камісіі па справах ЮНЭСКА (мал. 2), Міністэрства культуры [4, с. 35]. Высокая ацэнка дапамагала захаванню ва УА БДУКМ сістэмы этнамастацкай адукацыі ў крытычныя для яе моманты, паколькі сёння агульнавядома: "…гістарычны досвед шматлікіх культур сведчыць, што менавіта ***этнічная музыка*** і падтрымка яе традыцый спрыялі захаванню таго ці іншага народа як самастойнага сацыякультурнага суб'екта…" [3, с. 7]. Таму прыярытэты ў дзейнасці прыхільнікаў этнамастацкай адукацыі ва БДУКМ былі пастаўлены абгрунтавана і тактычна вывeрана.

Увесь гэты час ва БДУКМ працавала штогадовая **мадэль**: Міжнародная **канферэнцыя** "Аўтэнтычны фальклор" + **канцэрт** "Фальклор беларускай глыбінкі" + Рэспубліканскія сезонныя **фальклорныя школы** для дзяцей, + Тыдзень фальклорна-этнаграфічных **фільмаў** для моладзі + **Рэвіталізацыя** 1 абрада сродкамі дыпломнікаў кафедры + культурна-антрапалагічная **экспедыцыя** для падрыхтоўкі рэвіталізацыі наступнага абрада. Тое, што мадэль мае ўплыў не толькі на вучэбны працэс, але і на сітуацыю з вывучэннем і захаваннем традыцыйнай культуры ў краіне стала бясспрэчна зразумела ў 2013 годзе, калі даследаванні па традыцыйнай культуры ўсіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выпускніц года спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» атрымалі прызавыя ўзнагароды Рэспубліканскага конкурса навуковых работ студэнтаў, а самі яны сталі магістрантамі (а ў 2014 годзе – і аспірантамі) Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі [2, с. 8].



Малюнак 1. Рэвіталізацыя Купалля як дыпломны праект першага выпуску этнафоназнаўцаў (2009 г.) п/к Т.А. Пладуновай




Малюнак 2. Дыплом за захаванне НКС, якім узнагароджана спецыялізацыя Этнафоназнаўства (2008 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напрыканцы артыкула варта акрэсліць характар і перспектывы ўплыву на экалогію традыцыйнай культуры Беларусі з боку этнамастацкай адукацыі, наладжанай ва ўніверсітэце.

1. З 2004 года ва БДУКМ была спантанна выпрацавала і ўкаранена *мадэль* дзейнасці па захаванні НКС і ўдасканаленні этнамастацкай адукацыі, якая ўжо сёння мае ўплыў на традыцыйную культуру ў краіне.
2. У адпаведнасці з уласным месцам у сістэме ЎВА культуры і мастацтваў, БДУКМ неабходна працягваць і пашыраць дзейнасць па: а) далучэнні носьбітаў НКС да адукацыйных і рэкрэатыўных форм працы са студэнцкай моладзю; б) этнакультурным выхаванні сродкамі НКС дзяцей і моладзі – для пераемнасці традыцыйнай культуры Беларусі ў месцах яе бытавання – на вёсцы; в) пашырэнні этнамастацкай адукацыі ў мэтах культурнай бяспекі Рэспублікі.

**Спіс літаратуры**

1. Дорошевич, Э.К. Миф как явление культуры / Э.К. Дорошевич, Н.Г. Мартысюк // Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі: матэрыялы навук. канф. (Мінск, 25–26 сак. 2003 г.). – Мінск: БДУ культуры, 2003. – С. 55–63.
2. Калацэй, В. "Прарыў" без традыцый немагчымы / В. Калацэй // Культура, 2015. – № 4 (1182). – 24.01.2015. – 8 с.
3. Мациевский, И. Возрождение этнической музыки и специальное образование / И.Мациевский // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання: зборнік навуковых прац удзельнікаў III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29–30 красавіка 2009 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2009. – С. 7–9.
4. Хвир, Н. Состояние и проблемы охраны нематериального культурного наследия Республики Беларусь / Н.Хвир // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання: зборнік навуковых прац удзельнікаў III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29–30 красавіка 2009 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2009. – С. 34–35.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ